Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 4 (133), 2022

*УДК 821.161.3-311.6.09+821.162.1-311.6.09*

# Мастацкае ўвасабленне вобраза палкоўніка Аляксандра Лісоўскага і дзейнасці яго атрадаў у творах беларускіх і польскіх пісьменнікаў

Г.А. ГЛАДКОВА

**У артыкуле даследуецца пытанне мастацкай інтэрпрэтацыі гістарычнай асобы Аляксандра Юзафа Лісоўскага ў творах беларускіх і польскіх пісьменнікаў. У цэнтры навуковай увагі апынуліся раманы К. Карказовіча «Jeźdźcy Apokalipsy», Ф.А. Асяндоўскага «Lisowczycy», Л. Дайнекі «Пра лісоўчыка, злога хлопчыка». Аўтар артыкула прыходзіць да высновы пра рамантызацыю вобраза А. Лісоўскага ў творчасці Л. Дайнекі, яго рыцарскую ідэалізацыю ў рамане А. Асяндоўскага, своеасаблівую дэманізацыю ў гістарычнай прозе К. Карказовіча.**
**Ключавыя словы:** Смутны час, Рэч Паспалітая, Масковія, лісоўчыкі, сармацкая культура, мастацкі вобраз, жанр, стыль.

**The article examines the issue of artistic interpretation of the historical personality of Alexander Jozef Lisowski in the works of Belarusian and Polish writers. In the center of scientific attention there was K. Karkazovich's novel «Jezddzcy Apokalipsy», F.A. Osendovsky's «Lisowczycy», L. Daineko's «About a lisovchik, an evil boy». The author of the article comes to the conclusion about the romanticization of the image of A. Lisowski in the work of L. Daineko, his chivalrous idealization in the novel by A. Osendovsky, a kind of demonization in the historical prose of K. Karkazovich.**
**Keywords:** Time of Troubles, Polish-Lithuanian Commonwealth, Muscovy, Lisovchiki, Sarmatian culture, artistic image, genre, style.

XVII ст. займае асаблівае месца ў багатай на падзеі нацыянальнай гісторыі. Рэч Паспалітая разгарнула маштабную экспансію на ўсходзе, яна мела на мэце ўзмацненне палітычнага ўплыву на Масковію праз падтрымку самазванцаў на рускі трон. Перыяд з 1598 па 1618 гг. трапна названы ў гісторыяграфіі «смутным», гэта быў час складанага грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага крызісу суседняй дзяржавы. Аўтарытэтны расійскі даследчык дзейнасці атрадаў лісоўчыкаў і асобы іх легендарнага кіраўніка А.В. Зорын дэталёва прааналізаваў польскія і рускія крыніцы, выклаў біяграфію Аляксандра Юзафа Лісоўскага, ствараючы, паводле нацыянальнага стэрэатыпу, адмоўны, нават дэманічны вобраз палкоўніка, ахарактарызаваў паходы яго палка ў перыяд Смутнага часу [1]. Пра рэйды лісоўчыкаў пісалі таксама польскія гісторыкі Г. Віснер і А. Пшэпорка [2], [3]. З доляй рамантызацыі распавёў пра вайсковыя справы «шляхціча з Віленшчыны» В. Ластоўскі [4]. У мастацкай літаратуры неардынарная асоба Лісоўскага таксама атрымала сваю інтэрпрэтацыю: пра лісоўчыкаў пісалі Ф.А. Асяндоўскі, К. Карказовіч, Л. Дайнека. У беларускім літаратуразнаўстве асэнсаванню дзейнасці лісоўчыкаў надаў увагу В.І. Еўмянькоў [5], пра мастацкае ўвасабленне асобы А. Лісоўскага ў творчасці Л. Дайнекі пісала Т. Лаўрык [6]. Аднак комплекснага кампараўтыўнага літаратуразнаўчага аналізу асаблівасцей мастацкага адлюстравання вобраза знакамітага палкоўніка і дзейнасці яго атрадаў у перыяд Смуты да гэтага часу праведзена не было, чым тлумачыцца актуальнасць даследавання. Мэта – выявіць асаблівасці мастацкай інтэрпрэтацыі рэальнай гістарычнай асобы А. Лісоўскага і дзейнасці яго атрадаў у творах польскіх і беларускіх пісьменнікаў.

Матэрыялам для літаратуразнаўчага аналізу сталі гістарычныя раманы Казімежа Карказовіча «Jeźdźcy Apokalipsy», Фердынанда Антонія Асяндоўскага «Lisowczycy», Леаніда Дайнекі «Пра лісоўчыка, злога хлопчыка». Навуковае даследаванне праведзена з дапамогай культурна-гістарычнага метаду, а таксама метаду кампаратыўнага аналізу літаратурных твораў.

Першыя звесткі пра А. Лісоўскага адносяцца да пачатку XVII ст., калі ён змагаўся ў радах наёмных польскіх войскаў валашскага ваяводы Міхая I, потым у харугвах Яна Патоцкага. Пасля спынення ваенных баталій у Валахіі Лісоўскі накіраваўся ў Інфлянты, дзе вызначыўся падчас польска-шведскай вайны. Малады паручнік выявіў прыроджаныя лідарскія якасці, узначаліўшы выступленне супраць камандавання з патрабаваннем выплат, якіх даўно не атрымлівалі жаўнеры. Ваяр здолеў падпарадкаваць свайму ўплыву таварышаў па зброі, аб'яднаць іх і выступіць у абарону іх правоў. Пазней А. Лісоўскі падпаў пад інфамію, але не скарыўся: у хуткім часе ён прымаў удзел у паходзе Ілжэдзмітрыя II на Маскву.

У польскай літаратуры найбольш значным творам, які адлюстраваў падзеі Смутнага часу і рэйды лісоўчыкаў на землі Масковіі, стаў раман Казімежа Карказовіча «Jeźdźcy Apokalipsy» (1990) у трох частках. Вобраз А.Лісоўскага ў ім – адзін з галоўных, а назва твора – метафарычны выраз, замацаваны за лісоўчыкамі. Агульныя звесткі пра паручніка паведамляюцца на першых старонках, меркаванні пра яго неадназначныя: з аднаго боку, гэта знакаміты ваеннымі справамі шляхціч, якому спрыяе лёс падчас вылазак, штурмаў і аблог, асабістымі рысамі Лісоўскага лічацца ўважлівасць, кемлівасць, азарт, моцны характар, рашучасць і вернасць слову. Партрэтныя дэталі характарызуюцца лаканічнасцю (*«Твар яго быў сухі, вочы ззялі жвавасцю, цёмныя вусы ляглі крыламі пад злёгку гарбатым носам з рэзка акрэсленымі ноздрамі»* [7, с. 22] – тут і далей пераклад Г.Г.). Як правіла, акцэнт робіцца на апісанні абмундзіравання героя (кіраса, шлем з булавешкай і наноснікам, наплечнікі і наручы, жупан, свабодныя шаравары). Паручнік праявіў сябе падчас ваенных падзей у Інфлянтах. У баі Лісоўскі сам ацэньваў сітуацыю і прымаў рашэнне, аднак такія паводзіны былі расцэнены вялікім літоўскім гетманам Я.К. Хадкевічам як свавольства, што прывяло да канфлікту кіраўніка войска і яго падначаленага. Паплечнікі А. Лісоўскага адзначалі, што імпульсіўны характар паручніка не перашкаджаў яму, бо падчас бітвы ён «не губляе галаву», значыць, можна давяраць яго рашэнням. У выніку канфлікт Хадкевіча і Лісоўскага паўплываў на пераход апошняга на службу да Радзівіла. Неўзабаве пошук новых ваенных прыгод прывёў паручніка разам з двумастамі шабель да Ілжэдзмітрыя ІІ, аховай якога прапанавана заняцца сілам Лісоўскага. Праз пэўны час шляхціч пакіне Самазванца, атрад лісоўчыкаў пастулова дасягне некалькіх тысяч (у асноўным, за кошт данскіх казакаў, далучаліся да атрадаў і маскавіты), пра яго будуць хадзіць легенды. Аўтарскае адступленне дапаўняе аповед пра А. Лісоўскага ацэнкамі яго сучаснікаў: *«Многія тысячы людзей будуць праманўляць яго імя з жахам і праклёнамі не толькі ў Масковіі, але па ўсёй Еўропе. Яго жаўнеры будуць змагацца на Влтаве, Эльбе і Везеры, напояць коней у водах Рэйна. Зграі крумкачоў будуць кружыць над іх галовамі, пасля іх застанецца пустыня, а на ёй толькі трупы. Бо не чатыры, а тысячы вершнікаў Апакаліпсісу пройдуць праз чэшскія і нямецкія землі»* [7, с. 260].

Жорсткасць, уласцівая нападам лісоўчыкаў, спалучалася з суровай дысцыплінай у атрадах, за маруднасць ці баязлівасць пагражала выгнанне, за непадпарадкаванне загаду – шыбеніца. Пры гэтым нікога прымусам Лісоўскі не трымаў, любы мог пакінуць харугву па ўласным жаданні.

К. Карказовіч надаў рамантычны арэол вобразу Лісоўскага, параўнаў яго з сокалам, вылучыў дзве вядучыя рысы характару: справядлівасць і стратэгічны талент. Іх спалучэнне не толькі прыносіла перамогу над ворагам, але таксама спрыяла выключнай павазе кіраўніка сярод паплечнікаў. У шэрагу эпізодаў рамана Лісоўскі, перш чым прыняць канчатковае рашэнне, слухае меркаванні таварышаў, гэта стварала адчуванне самакаштоўнасці ва ўдзельнікаў лёгкай кавалерыі. Лісоўскаму ўласцівая асцярожнасць, абачлівасць, ён правяраў людзей, якія далучаліся да яго атрада, сам праводзіў апытанні, быў надзвычай празорлівым военачальнікам. Паказальным для разумення характару героя з'яўляецца эпізод з 1612 г., калі, нягледзячы на загад Лісоўскага не чыніць разбой гораду, які будзе карміць атрад усю зіму, у Старадубе пачаліся крадзяжы і гвалт. Кіраўнік лісоўчыкаў учыніў расправу над тымі, хто парушыў дамоўленасць, пры чым на пакаранне смерцю марадзёраў было загадана глядзець усім падначаленым. Гэта стала ўрокам і ўзмацніла дысцыпліну сярод жаўнераў. Яшчэ адной асаблівасцю характару героя была вытрымка: ён ніколі не паказваў войску слабасць, нават у самым крытычным становішчы, бо лічыў, што кіраўнік павінен быць вольным ад хваляванняў. Таксама немалаважным выглядае факт клопату Лісоўскага пра раўнамерны падзел дабытага, што ўзнімала ваяўнічы дух і падтрымлівала высокую баяздольнасць атрадаў.

Панарама рэйдаў, якія насілі маланкавы характар, абазначана ў рамане агульнымі рысамі: спаленыя мястэчкі, разрабаваныя гарады, забітае мужчынскае насельніцтва і згвалтаваныя жанчыны (*«Страх напаў на ўсю паўночную Русь...»* [7, с. 366]). Маскавіты лічылі легендарнага ваяра Антыхрастам, якога нібы ратуе нячыстая сіла, пераносіць з краю ў край. Такая дэманізацыя асобы Лісоўскага толькі ўзмацняла жах, які апанаваў заходнімі землямі Маскоўскай дзяржавы. Гарады здаваліся, сустракалі Лісоўскага хлебам-соллю, каб пазбегнуць разрабавання і вынішчэння. Пасля аблогі Смаленска псіхалагічны стан героя змяніўся: ён больш не бачыў мэты ў працягненні захопніцкіх рэйдаў, думаў пра наведванне радзімы. Аднак адбываецца вяртанне пад штандар гетмана Хадкевіча, абраны новы накірунак ваяўнічых паходаў – на поўнач, у Фінляндыю. Познец Лісоўскі скіруе атрады на ўсход, яго прывабіць нязве-

даны Урал, які абяцаў незлічоныя багацці. Амбіцыі і самаўпэўненасць героя трымалі яго на рускіх землях напрацягу пяці гадоў, толькі ў 1613 г. ён вяртаецца на радзіму, аднак праз некаторы час яго зноў бачаць на рускай Поўначы.

Адносна раптоўнай смерці камандзіра лісоўчыкаў хадзілі розныя чуткі. З біяграфіі А. Лісоўскага вынікае, што ён раптоўна зваліўся з каня і сканаў падчас чарговага агляду войска ў кастрычніку 1616 г. К. Карказовіч падаў наступнае тлумачэнне: па аўтарскім меркаванні, А. Лісоўскі быў атручаны з дапамогай зёлак, зашытых у падушку. Яны, на думку пісьменніка, справакавалі апаплексічны ўдар і прывялі да заўчаснай смерці здаровага, фізічна моцнага чалавека. Пасля страты камандзіра лісоўчыкі працягвалі ваяваць на землях Маравіі, Чэхіі, даходзілі да Рэйна, у 1621 г. ўдзельнічалі ў Хоцінскай бітве.

Тактыка маланкавага нападу, удзел самаго кіраўніка ў разведцы, ваенная кемлівасць, мабільнасць атрадаў, якія не мелі абозаў, нечаканасць і аператыўнасць рэйдаў – такімі былі ўмовы перавагі лісоўчыкаў у ваенных справах.

Польскамоўны пісьменнік пачатку XX ст. Фердынанд Антоні Асяндоўскі прысвяціў дзейнасці лісоўчыкаў аднайменны гістарычны раман [8]. У адпаведнасці з традыцыяй, пашыранай у польскай літаратуры, асоба Лісоўскага надзелена рысамі адважнага ваяра, здольнага хутка аднавіцца пасля паражэнняў. Лісоўчыкі паказаны як атрад няўлоўных герояў-пераможцаў, які трымаў у жаху землі Масковіі «да Белага мора, Волгі і Урала». Пісьменніцкая інтэрпрэтацыя асобы галоўнага героя грунтуецца на рыцарскай ідэалізацыі вобраза (суровы твар, сталёвыя халодныя вочы, моцны торс і вузкія сцёгны, прымацаваная да пояса доўгая крывая шабля).

У цэлым, мы назіраем сугучную трактоўку вобраза А. Лісоўскага ў раманах Ф.А. Асяндоўскага і К. Карказовіча, аднак Асяндоўскі робіць вобраз больш індывідуальным, маўленне героя насычана трапнымі народнымі выслоўямі, яно ў большай ступені вылучае адметнасці асобы. У адрозненне ад К. Карказовіча, які выкарыстаў прыём панарамнага выкладу падзей Смутнага часу, засяродзіўшы ўвагу на некалькіх сюжэтных лініях, Ф. Асяндоўскі меў магчымасць больш глыбока сканцэнтравацца на канктрэтным вобразе. Значную частку рамана «Lisowczycy» складае аповед пра далейшы лёс харугваў Лісоўскага пасля смерці апошняга. Выдатны знаўца этнаграфіі, геаграфіі і біясферы Далёкага Усходу, Ф.Асяндоўскі спыніўся на жыцці лісоўчыкаў на рускай Поўначы, іх узаемадзеянні з мясцовымі плямёнамі (вагуламі, самаедамі, калмыкамі і інш.), якія вырашылі, карыстаючыся бязладдзем, зрабіць Сібір незалежнай. На працягу пяці гадоў атрад колькасцю ў трыццаць палякаў, пяцьдзесят данскіх казакаў і дваццаць чалавек іншых нацыянальнасцей будзе ўступаць у сутычкі з мясцовым насельніцтвам, шукаць карысныя выкапні і каштоўныя металы, выжываць у суровых прыродных умовах.

Ф.А. Асяндоўскі здолеў перадаць мастацкімі сродкамі атмасферу, максімальна набліжаную да рэалій XVII стагоддзя стала паспяховай пісьменніцкая спроба рэканструкцыі эпохі Смутнага часу, дзякуючы выкарыстанню розных прыёмаў (маўленне персанажаў, партрэтная характарыстыка, рэчыўна-побытавая дэталь, аўтарскае адступленне этнаграфічнага характару і г. д.).

У беларускай літаратуры таксама ёсць мастацкі варыянт асэнсавання асобы А. Лісоўскага. Маецца на ўвазе гістарычны раман Л. Дайнекі «Пра лісоўчыка, злога хлопчыка» [9]. Твор пабудаваны як паралельны выклад падзей XXI і XVII ст., што стварае ўяўленне пра шчыльную злучанасць сучаснасці з мінулым: беларусы сёння – гэта нашчадкі тых, хто жыў на гэтай зямлі некалькі стагоддзяў таму, і лёсы іх – люстэркавы адбітак лёсаў продкаў. Аналізуючы раман, Т. Лаўрык зазначала: *«Л.Дайнека, адступаючы ад рэальных падзей, рамантызуе вобраз лісоўчыкаў, надае ім рысы нацыянальных змагароў. […] Аднак непараўнаныя ў кавалерыйскіх сечах і безаглядная мужнасці, лісоўчыкі вылучаліся таксама жорсткасцю, авантурызмам і прагаю здабычы»* [6, с. 371]. Для герояў твора, якія жывуць у XXI ст., лісоўчыкі ўяўляюцца перш за ўсё рыцарамі-рамантыкамі, невыпадкова Антон Даніловіч-Гоцкі піша раман «Тры лісоўчыкі» (аналогія з мушкецёрамі А. Дзюма): *«Трэба даць чытачу, асабліва маладому, кніжку, якая вучыць адвазе, вернасці і гордасці за свой край, свой народ»* [9, № 1, с. 52].

Л. Дайнека, у адрозненне ад польскіх пісьменнікаў, у максімальнай ступені па-мастацку аздобіў факты біяграфіі А. Лісоўскага: пачаў з дзіцячых гадоў і выхавання на Берасцейшчыне, распавёў пра вучобу ў Еўропе і ўдзел у рыцарскіх турнірах. *«Почут пра Аляксандра Лісоўскага ішоў па ўсім Вялікім Княстве. Яго пабойваліся, з ім хацелі не варагаваць, а сябраваць. І паступова вакол яго пачала гуртавацца шляхецкая моладзь»* [9, № 2, с. 14]. Па версіі пісьменніка, Лісоўскі ставіў высакародную мэту, ствараючы ўласны атрад: ахоўваць межы дзяржавы на ўсходзе і на поўдні, там, адкуль ідзе пагроза Вялікаму княству Літоўскаму: *«Мне хочацца, каб было нешта мабільнае і лятучае, каб яно прасочвалася, як навальнічная вада ў перасохлую*

*зямлю, на чужую тэрыторыю, біла ворага на ягонай зямлі»* [9, № 2, с. 16]. Ніхто, на думку Аляксандра Лісоўскага, не павінен абмяжоўваць залатую шляхецкую вольнасць. Вось чаму ён зрабіўся ўпартым перакананым ворагам Масковіі, дзе ўся ўлада знаходзілася ў руках цара. Як і Ф.А. Асяндоўскі, Л. Дайнека згадаў легенду пра Залатую Бабу, якую быццам бы адшукалі лісоўчыкі ў глыбі Сібіры. Завяршаецца аповед пра прыгоды лісоўчыкаў прарочымі словамі галоўнага героя, якія сімвалічна замыкаюць сюжэтнае кола: *«"Думаю, гадоў праз пяцьсот з Божай дапамогаю ўваскрэснем усе мы, паны-брацці, на сваёй роднай зямлі. На зямлі, якую любілі, якую баранілі ад ворага. Хацелася б ведаць, хто і што сустрэне нас тады, якімі вачыма будуць глядзець на нас тадышнія людзі"* [9, № 3, с. 62–63].

Праведзены кампаратыўны аналіз гістарычных раманаў, у якіх раскрываецца вобраз А. Лісоўскага, дазваляе вылучыць некаторыя адметнасці аўтарскай інтэрпрэтацыі падзей Смутнага часу і адлюстравання дзейнасці лісоўчыкаў на азначаным гістарычным фоне. Так, асаблівасцю творчага метаду К. Карказовіча з'яўляецца дакладнасць аповеду, якая грунтуецца на дэталёвым веданні гісторыі. Асоба А. Лісоўскага трактуецца пісьменнікам у кантэксце падзей «маскоўскай Смуты», якая вымагала такіх неардынарных герояў. Пры гэтым К. Карказовіч канцэнтруе ўвагу на знешніх характрыстыках, учынках героя, у рамане не заўважана псіхалагізацыя вобразаў, аўтар хутчэй скіраваны на панарамны аповед. Ф.А. Асяндоўскі ў большай ступені абапіраецца на ролю моўных сродкаў пры перадачы гістарычнай атмасферы і стварэнні персанажаў: у тэксце шмат лацінамоўных выразаў, народных выслоўяў, аўтэнтычнай гаворкі, маўленне герояў вылучаецца індывідуальнасцю. Лісоўскі Асяндоўскага дбае не толькі пра сябе, ён заклапочаны лёсам дзяржавы, што робіць вобраз больш прыцягальным, патрыятычным, не пазбаўленым глыбокіх перажыванняў і ўнутраных разваг. Лісоўскі ў рамане Асяндоўскага не толькі і не столькі жорсткі ваяр і таленавіты стратэг, гэта, у першую чаргу, чалавек, грамадзянін, неабыякавы да лёсу айчыны ў пераломны гістарычны момант. У рамане Л. Дайнекі лісоўчыкі паказаны баявым рамантычным брацтвам. Акцэнт пісьменніка зроблены на ідэі кансалідацыі нацыі з дапамогай па-прыгодніцку афарбаванай гісторыі. Арыгінальная аўтарская ідэя повязі часоў дазваляе вольна абыходзіцца з гістарычным матэрыялам, ствараючы на яго аснове нацыянальны міф.

Асоба Аляксандра Юзафа Лісоўскага набывае легендарны арэол менавіта ў творы беларускамоўнага аўтара. Л. Дайнека рамантызуе гісторыю, адштурхоўваецца ад фактаў і стварае ўласную версію беларускай мінуўшчыны. Стаўленне даследчыкаў да асобы А.Лісоўскага палярнае, у залежнасці ад стэрэатыпаў і нацыянальнага гістарычнага кантэксту ў ім бачаць то рабаўніка і жорсткага ваяра, то носьбіта ідэалаў сармацкай культуры. Думаецца, мастацкая інтэрпрэтацыя асобы А. Лісоўскага будзе спрыяць актывізацыі нацыянальнай памяці і больш глыбокай чытацкай зацікаўленасці айчыннай гісторыяй.

**Літаратура**

1. Зорин, А. В. Александр Юзеф Лисовский: герой Смутного времени [Электронный ресурс] / А. В. Зорин // История военного дела: исследования и источники. – 2021. – Т. III. – Режим доступа : https://cyberleninka.ru/article/n/aleksandr-yuzef-lisovskiy-geroy-smutnogo-vremeni. – Дата доступа : 29.01.2021.

2. Wisner, H. Lisowczycy / H. Wisner. – Warszawa, 1995. – 153 s.

3. Пшэпюрка, А. Г. Ад дабраахвотнікаў да наёмных жаўнераў. Полк лісоўчыкаў у перыяд вайны з Масквой / А. Г. Пшэпюрка // Arche. – 2012. – № 6. – С. 11–40.

4. Lisouszczyki // Homan. – 1916. – №18.

5. Еўмянькоў, В. І. Навіны «краёвыя» і замежныя ў польскамоўных выданнях другой паловы XVI – першай чвэрці XVII ст. «Меркурый ардынарыйны» (спроба апісання і верыфікацыі гістарычных крыніц) / В. І.Еўмянькоў. – Магілёў : МДУ імя А.А.Куляшова, 2016. – 184 с.

6. Лаўрык, Т. Адлюстраванне эпохі праўлення Жыгімонта III Вазы ў рамане Л. Дайнекі «Пра лісоўчыка, злога хлопчыка» / Т. Лаўрык // Беларуска-польскія моўныя, літаратурныя, гістарычныя і культурныя сувязі. Да 220-годдзя з дня нараджэння Адама Міцкевіча : зб. арт. па матэрыялах міжнар. навук. канф. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: І. Э. Багдановіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2018. – С. 364–373.

7. Korkozowicz, K. Jeźdźcy Apokalipsy / K. Korkozowicz. – Warszawa : Wydawn. MinisterstwaObronyNarodowej, 1990. – 722 s.

8. Ossendowski, F. A. Lisowczycy. Powieść historyczna / F. A. Ossendowski. – Poznań : Wydawnictwo Polskie R. Wegnera, 1929. – 277 s.

9. Дайнека, Л. Пра лісоўчыка, злога хлопчыка / Л. Дайнека // Дзеяслоў. – 2010. – № 1. – С. 15–75 ; № 2. – С. 13–76 ; № 3. – С. 13–66.

Витебский государственный
университет имени П.М. Машерова

Поступила в редакцию 02.12.2021